детской эмоциональностью. На следующем этапе в подсознании возникает образ, отличный от объекта. Г. Гельмгольц называет этот феномен иллюзиями органов чувств [3, 24]. Знакомство с несколькими объектами создает соответственно несколько образов, с течением времени сливающихся в один. Этот суммарный образ фиксируется в рисунках детей, перемещаясь из подсознания в сознание. Накопленный опыт восприятия со временем позволяет ребенку частично дифференцировать детали и, вследствие этого, разнообразить свои практические работы, являющиеся, по сути, рефлексией на полученную информацию.

Особенности архитектуры позволяют использовать системный подход для формирования духовных, нравственных качеств ребенка, которые становятся фундаментом для формирующейся личности. Автором разработан проект программы для системы дополнительного дошкольного образования, целью которой является формирование у детей основ духовной культуры, эстетической потребности, вкуса, интереса к эстетическим объектам.

Ядром предлагаемого педагогического модуля становится архитектура как наиболее близкий, понятный детям вид искусства, позволяющий знакомиться комплексно с другими видами искусств. Функциональность архитектуры позволяет ввести детей в сказку, использовать игру, театрализацию, метод эмпатии.

Архитектура как порождение культуры несет в себе культурологический потенциал. Взаимодействие различных видов искусств, их необычность порождают внутренние импульсы, создающие эстетическую установку, придающую эстетическое значение объектам. Зодчество — вполне доступный пониманию детей вид искусства. Более того, концентрируя в себе, связывая другие виды искусств, оно способствует их разностороннему, гармоничному развитию. Неразрывная связь с социальными процессами, с духовной жизнью общества способствует решению проблемы духовной наполненности личности ребенка, формированию духовных ценностей.

## ЛИТЕРАТУРА

1. Выготский Л. С., Психология. М., 2000.
2. Культурология. /Под редакцией Драга В. Г. Ростов-на-Дону, 1995.
3. Психология ощущение и восприятия: Хрестоматия по психологии./ Под ред. Ю. Б. Гиппенрейтер и др. М., 2002.
4. Степанов Е. Н., Лузина Л. М. Педагогу о современных подходах и концепциях воспитания. М., 2002.

***Gorlina O. Z.***

*THE ARCHITECTURAL HERITAGE IN THE FORMATION OF CULTURAL OUTLOOK IN PRE-SCHOOL CHILDREN*

*This work studies influence of architecture on forming of aesthetic attitude to outward things of children 5-6 years old. Architecture allows acquainting with cultural heritage. This familiarity is realized by means of games, stories, adaptations for the stage. Architecture possesses properties (functionality, constructivity, aestheticism), which make it interesting for children. In this way children can familiarize themselves with world culture.*

## СВЯТЫ Ў СТУДЭНЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

**Гуцько В. Л.,**
**выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў**

Студэнцкая культура складаецца падчас навучання моладзі ў ВНУ, вызначаецца сістэмай каштоўнасцей, норм, стэрэатыпаў, светапоглядаў і адпаведнай ёй дзейнасці. Катэгорыя студэнцкай культуры ўключае не толькі вынік, але і працэс бесперапыннага самаўдасканалення асобы маладога чалавека ў інтэлектуальнай, духоўнай, фізічнай і іншых сферах сацыякультурнай дзейнасці. Студэнты імкнуцца спазнаць сувязі і заканамернасці пераўтварэнняў у соцыуме, мяркуюць аб далейшай жыццёвай стратэгіі, выбар якой інтэнсіўна адбываецца на працягу навучання.

Адна з паказальных форм студэнцкай культуры — арганізацыя і правядзенне студэнцкіх святочных мерапрыемстваў. Яна дазваляе прасачыць творчую ініцыятыву студэнцкай моладзі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Святочныя мерапрыемствы садзейнічаюць інтэнсіўнай сацыялізацыі маладых людзей. Каб разгледзець змест і формы студэнцкіх свят, мы прапануем правесці кантэнт-аналіз мерапрыемстваў, якія адбыліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на працягу мінулага дзесяцігоддзя. Базай даследавання была выбрана менавіта гэта навучальная ўстанова таму, што студэнты маюць магчымасць асвойваць творчыя спецыяльнасці і з максімальнай сілай выкарыстоўваюць свае веды, уменні і навыкі для таго, каб быць не толькі актыўнымі ўдзельнікамі, а і непасрэднымі стваральнкамі свят.

Аналіз дакументальных крыніц ажыццяўляўся на выснове відэазапісу свят. Былі разгледжаны святочныя мерапрыемствы ў прамежак часу з 1995 да 2007 гг. Некалькі фактараў сталі вызначальнымі ў падвядзенні вынікаў даследавання вызначаных дакументальных крыніц:

1. Удзел студэнтаў у пастаноўцы і арганізацыі святочнага мерапрыемства — 10 балаў (актыўнае — 5; пасіўнае — 2; змешанае — 3).

2. Ступень самастойнасці правядзення свята — 5 балаў (высокая — 2,5; сярэдняя — 1,5; нізкая — 1).

3. Узровень творчага вынаходніцтва ў выкарыстанні сімвалаў свята — 15 балаў (сімвалы выкарыстоўваюцца як іканічныя знакі — 3,75 бала; сімвалы выкарыстоўваюцца як індэксальныя знакі — 5,25 балаў; сімвалы набываюць важны эмацыянальны змест — 6 балаў).

4. Ступень дакладнасці выканання — 7 балаў (высокая — 3,5 бала; сярэдняя — 2,1 бала; нізкая — 0,4 бала).

5. Сувязь святочных мерапрыемстваў з арыентацыяй на мінулае, сучаснасць, будучыню — 15 балаў (на мінулае — 1,5; на сучаснасць — 2,25; на будучыню — 2,55; сумяшчэнне арыентацыі на мінулае і сучаснасць — 2,55; сумяшчэнне арыентацыі на сучаснасць і будучыню — 2,25; сумяшчэнне арыентацыі на мінулае і будучыню — 1,2; сумяшчэнне арыентацыі на мінулае, сучаснасць і будучыню — 2,7).

6. Характарыстыка ўдзелу студэнтаў у святочных мерапрыемствах — 15 балаў (як актыўныя ўдзельнікі — 9; як зацікаўленыя, але пасіўныя ўдзельнікі — 3,75; як незацікаўленыя ўдзельнікі — 1,5; як гледачы — 0,75).

7. Арыентацыя на культурнае асяроддзе — 13 балаў (арыентацыя на культурнае асяроддзе Захаду — 2,6; арыентацыя на культурнае асяроддзе Усходу — 3,9; арыентацыя на культурнае асяроддзе Беларусі — 6,5).

8. Мадэль паводзін, якая пераважае пры правядзенні святочнага мерапрыемства — 20 балаў (актыўна-ініцыятыўная — 14; пасіўна-канфармісцкая — 6).

Далей разгледзім падрабязна апісанне святочных мерапрыемстваў — урачыстых лінеек, вечарын адпачынку, святочных інаўгурацый студэнтаў-першакурснікаў і справаздачных канцэртаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, якія маюць характэрныя рысы для большасці святочных урачыстасцей ці вылучаюць значныя адметнасці ў шэрагу падобных мерапрыемстваў. Праведзенае дакументальнае даследаванне дазваляе вызначыць якасны стан студэнцкай культуры ў суадносінах са шкалой градацыі, якую мы прапанавалі.

Урачыстая лінейка, якая была прысвечана пачатку 1995/96 навучальнага года, атрымала 32,7 бала на аснове прапанаваных крытэрыяў. Удзел студэнтаў у арганізацыі і пастаноўцы свята быў актыўным. Выкладчыкі і рэктарат ВНУ ажыццяўлялі кантроль за выкананнем абавязкаў і дапамагалі студэнтам у вырашэнні складаных пытанняў на працягу падрыхтоўкі свята. Таму магчымасць самастойнага правядзення мерапрыемства ацэньваецца як сярэдняя. Студэнты падчас правядзення ўрачыстасці імкнуліся ўвасобіць ідэю свята праз прадстаўленне індэксальных знакаў і сімвалаў — плакатаў, харугваў, фаліянтаў. Каштоўнасці, на якія звяртала ўвагу студэнцкая моладзь, у асноўным былі звязаны з мінулым і будучыняй. Студэнты былі зацікаўленымі, але пасіўнымі ўдзельнікамі, ім адводзілася другасная роль. Ва ўрачыстай лінейцы дакладна прасочваецца арыентацыя моладзі на самабытную культуру Беларусі. У мерапрыемстве пераважае пасіўна-канфармісцкая мадэль паводзін студэнтаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізатары капусніка, які адбыўся ў Беларускім універсітэце культуры ў кастрычніку 1996 г., ставілі асноўнай мэтай пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. Ва ўрачыстасці прымалі ўдзел студэнты ўсіх курсаў кафедры мэнеджмэнта сацыякультурнай сферы, у якасці гледачоў (якіх сабралася вялікая колькасць) прысутнічаў і прафесарска-выкладчыцкі склад гэтай кафедры. Студэнты былі вядучымі мерапрыемства і час ад часу ўступалі ў дыялог з залай і выкладчыкамі, што сведчыла аб самастойнасці маладых людзей. Моладзь кожнага курса пасылала гумарыстычныя прывітанні навічкам. У адным з выступленняў студэнтаў быў створаны шарж на выкладчыкаў. Такі ўчынак можна расцэньваць як індэксальны знак, які мае спасылку на пэўныя вобразы людзей і іх дзеянні. Адзін з самых эмацыянальных сімвалаў быў створаны ў фінале капусніка. Ён змяшчаў прычашчэнне першакурснікаў блінамі са студэнцкай сталоўкі. Рытуальнае дзеянне суправаджалася гумарыстычнымі спевамі «кухара». Сярод студэнцкай моладзі, якая актыўна ўдзельнічала ў капусніку, мадэль жыццёвай стратэгіі накіравана на мінулае і сучаснасць. На выснове прагляду відэазапісу мерапрыемстваў ствараецца ўражанне, што актыўна-ініцыятыўная мадэль паводзін студэнцтва з'яўляецца пераважнай. Агульная колькасць балаў студэнцкага капусніка — 42,05.

Пасвячэнне ў студэнты, якое адбылося ў 1998 г. у Доме афіцэраў, было арганізавана пастановачнай групай студэнтаў трэцяга курса кафедры рэжысуры абрадаў і свят. Кіраваў арганізацыйнай работай і групай выканаўцаў дацэнт кафедры В. П. Мароз. Удзел студэнтаў у пастаноўцы быў змешаным — студэнты выконвалі частку абавязкаў арганізатараў і ролі выканаўцаў на свяце. Па задуме пастаноўшчыкаў мерапрыемства, студэнты першага курса былі ўроўнены з рэктаратам універсітэта, і таму ролі студэнтаў надавалася асноўнае значэнне ў сімволіцы свята. Узровень творчай актыўнасці быў высокі, паколькі сімвалы, якія выкарыстоўваліся ў мерапрыемстве, былі вельмі запамінальнымі і эмацыянальнымі. Яны набылі важную сэнсавую нагрузку — дрэвы ведаў, студэнцкія капелюшы. У пасвячэнні першакурснікаў пераважала арыентацыя на тры адмежкі часу — мінулае (спадчына знакамітых беларускіх асветнікаў), сучаснаць (дыялог пакаленняў выкладчыкаў і студэнтаў) і будучыня (перадача дрэва ведаў ад асветнікаў Беларусі сучасным навукоўцам). Пастаноўшчыкі імкнуліся да таго, каб студэнты і рэктарат паўсталі роўнымі ў вачах гледачоў. Такім чынам, стала відавочнай пераемнасць пакаленняў. У інаугурацыі першакурснікаў вылучаецца пераважная арыентацыя ўсіх удзельнікаў свята на беларускае асяроддзе. Мадэль паводзін студэнцтва ахарактарызоўваецца як пасіўна-канфармісцкая. Такім чынам, святочная інаугурацыя 1998 г. ацэньваецца ў 38,2 бала.

Правядзенне ўрачыстай лінейкі 1 верасня 2005 г. адбывалася пры ўдзеле студэнтаў і выкладчыкаў кафедры рэжысуры абрадаў і свят. Галоўным рэжысёрам урачыстасці з'яўлялася старшы выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят Н. А. Міцкевіч. Удзел студэнтаў пры падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемства быў актыўным. Ступень самастойнасці ў арганізацыі свята разглядаецца намі як сярэдняя. Сімвалы ў свяце набылі значнае эмацыянальнае напаўненне — цудоўна была пададзена перад гледачамі сімволіка універсітэта, на працягу ўрачыстай лінейкі адбывалася карнавальнае шэсце персанажаў, якія ўвасаблялі розныя віды і жанры мастацтва. Выканальніцкае майстэрства было на высокім узроўні. У святочнай дзеі была падкрэслена арыентацыя моладзі на мінулае і сучаснасць. Асноўная ідэя пастаноўкі была сканцэнтравана на беларускай тэматыцы. Большая частка студэнцтва, якое прымала ўдзел у пастаноўцы, кіравалася пасіўна-канфармісцкай мадэллю паводзін. Агульная колькасць балаў урачыстай лінейкі, прысвечанай пачатку 2005/06 навучальнага года, — 48,5.

Аналіз святочных мерапрыемстваў дапамагае вылучыць характэрныя рысы студэнцкай культуры:

- сумяшчэнне творчай актыўнасці студэнтаў і недасканалага выканальніцкага майстэрства моладзі ў студэнцкіх святах, якія былі створаны па яе асабістай ініцыятыве. Нізкая мастацкая каштоўнасць такіх мерапрыемстваў мае шэраг падстаў, адны з іх — недастатковая колькасць рэпетыцый і ігнараванне імкнення ўбачыць свае задумы з боку незацікаўленага гледача;

РЭПОЗІТОРЫЙ БДУКІ

- сумесная творчасць выкладчыкаў і студэнтаў у пастаноўцы афіцыйных мерапрыемстваў ВНУ. Яна садзейнічае актыўнай сацыялізацыі моладзі і выкарыстанню студэнцтвам актыўна-ініцыятыўнай мадэлі паводзін у грамадстве;
- нетужлівы і іранічны погляд моладзі на навакольную рэчаіснасць. Ён становіцца асабліва адметным на мерапрыемствах, якія праводзяць студэнты па сваёй ініцыятыве. На такіх вечарынах студэнты жартуюць над сваімі выкладчыкамі, нагадваюць самыя запамінальныя выпадкі са студэнцкага жыцця;
- распаўсюджванне антытэзы «студэнты — выкладчыкі». Яна становіцца вельмі адметнай у мерапрыемствах, якія студэнцтва праводзіць самастойна. Моладзь усведамляе сябе моцнай, разумнай, энергічнай, задорнай.

**_Gutko O. L._**

*FESTIVALS IN STUDENT'S CULTURE*

*The article researches student's festivals as an exemplary form of student's culture. Analysis is based on video films of festivals. One of the results of research consists in practical recommendations on the use of creativity of students.*

## СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНАЯ АКТИВНОСТЬ КАК НЕОБХОДИМОЕ УСЛОВИЕ РАЗВИТИЯ МУЗЫКАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЫ СОВРЕМЕННЫХ ПОДРОСТКОВ ВО ВНЕШКОЛЬНОМ КУЛЬТУРНО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНОМ ПРОСТРАНСТВЕ

**Жолобова В. В.,**
**магистр педагогических наук, преподаватель музыкально-теоретических дисциплин**
**Могилёвской государственной детской школы искусств № 2**

В социально-культурных и экономических трансформациях конца XX — начала XXI в. особую актуальность приобретает проблема гуманистически ориентированного развития общества, совершенствования духовной культуры человека.

По силе эмоционального воздействия музыкальное искусство является одним из наиболее действенных средств в художественно-эстетическом развитии личности современного подростка.

Постоянное присутствие музыки в жизни подростков является непременным атрибутом времени. Современные средства массовой информации сегодня обеспечивают широту воздействия музыки на слушателя, вследствие чего остро встает проблема пассивного музыкального восприятия, тяготения к жанрам легкой музыки, преобладания прикладных музыкальных потребностей, стандартизации музыкальных интересов.

Исследования в области современного музыкального образования и воспитания позволяют утверждать, что сегодня становится актуальным воспитание активного, сознательного реципиента, формирование познавательных и музыкально-творческих интересов и потребностей среди подростков как фундамента художественно-эстетического развития личности [1].

В этой связи огромное значение приобретает система организованного педагогического воздействия — музыкального воспитания – как основополагающий фактор социального, духовного, художественно-эстетического развития личности.

Ключевым моментом в процессе музыкального воспитания является приобщение личности к музыкальной культуре общества, овладение опытом музыкальной деятельности и способности воспринимать музыку, другими словами, формирование музыкальной культуры личности. Бифункциональность музыкального воспитания проявляется в том, что музыкальная культура является одновременно и средством формирования личности, и целью воспитания.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ